Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 40. Вільня, Нядзеля 20 Лістапада 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год — 4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Рэлігійная палітыка БХД.

Беларускую Хрысьціянскую Дэмакрацыю разьвілі, арганізавалі і, як кажуць, паставілі на ногі Беларусы каталікі. Дзеля гэтага і была яна спачатку грамадзкай арганізацыяй выключна Беларусаў каталікоў. Праўда, маглі належыць да яе і Беларусы праваслаўныя, але фактычна не належылі, бо пачаткавая праграма БХД была такой, што належыць да яе праваслаўным проста не выпадала. У гэтай пачаткавай праграме („Ustawa i Prahrama Chryścijanskaj Demokratyčnaj Złučnaści Biełarusaŭ“. Miensk. 1920.), ці вярней у арганізацыйным статуце ў § 6 між іншым чытаем гэткі сказ: ...„Urad Hłaŭny składajecca z 10 siabroŭ Złučnaści i adnaho patrona, katorym pawinien być katalicki ksiondz“. Ясна, што гэткі параграф у статуце БХД надаваў арганізацыі каталіцкі вызнанёвы характар і адпіхаў ад сябе Беларусаў праваслаўных.

Гэтую пахібу хутка спасьцераглі і павадыры БХД. Зварачвалі на яе ўвагу так-жа Беларусы праваслаўныя. Хутка сталася ясным, што кожная беларуская грамадзка-палітычная арганізацыя павінна быць такой што да рэлігіі, якой ёсьць сам народ беларускі. Хутка сталася ясным, што паддзержываць і паглыбляць у Беларусаў рэлігійны падзел выходзе толькі на карысьць адвечнай польскай і расейскай у нас палітыцы, якая ад вякоў на гэтым падзеле робіць свой брыдкі інтэрас.

Пасьля якіх пяцёх гадоў існаваньня БХД, як беларускай каталіцкай арганізацыі, аканчальна насьпела думка аб тым, што БХД мусіць быць ператорана ў беларускую арганізацыю агульна хрысьціянскую: і каталіцкую і праваслаўную разам, і што рэлігійныя правы як каталікоў, так і праваслаўных мусяць быць у праграме адпаведна забясьпечаны.

Так і сталася. На адбыўшымся ў 1926 г. Зьезьдзе БХД у Вільні была прынята абноўленая праграма, у якой беларуская вызнанёвая справа прыняла новую форму. Паводле гэтай праграмы да БХД могуць належаць нароўні і Беларусы каталікі і Беларусы праваслаўныя. Відаць гэта з IX разьдзелу праграмы, які гавора аб рэлігіі, а ў якім, між іншым, пад § 23 чытаем: „Касьцёл (Царква) у сваім унутраным жыцьці карыстаюцца з поўнай свабоды і кіруюцца кананічным правам“. Тут ужо бачым, што і Касьцёл і Царква не разьдзяляюцца, а трактуюцца нароўні.

Ад гэтага часу да БХД належаць як каталікі, так і праваслаўныя, як адны, так і другія ў сваіх рэлігійных справах карыстаючыся поўнай аўтономіяй. Ад гэтага часу — паводле ўжо прынятай традыцыі — старшынёй звычайна бывае каталік, а мяйсцы двух ягоных заступнікаў займаюць праваслаўныя.

Але жыцьцё не стаіць на месцы. За некалькі апошніх гадоў на беларускіх землях паявілася новае зьявішча — Унія. Сярод беларускіх хадэкаў аказаліся уніяты, або іх староньнікі. Прад БХД паўстала новае пытаньне: як да справы Уніі аднесьціся?

Каб пачуць жывыя ў гэтай справе галасы, БХД зьмясьціла ў «Бел. Крыніцы» пару прысланых артыкулаў прыхільных Уніі, як «Неабходнасьць рэлігійнага злучэньня на Беларусі» (15.X.31) і інш. Гэта выклікала галасы іншыя, галасы Унію крытыкуючыя, а нават і выразна ёй праціўныя. Дзеля об'ектыўнасьці „Бел. Крыніца“ зьмяшчала і гэтыя апошнія. Асабліва з артыкулаў праціўных Уніі выразны «Праваслаўе і Унія» (23.X.1932), праваслаўны аўтар якога рашуча выказваецца проціў Уніі.

Спорка між хадэкамі праваслаўнымі і уніятамі ня спыняецца. Рэдакцыя „Бел. Крыніцы“ атрымлівае ўсьцяж новыя ў гэтай справе артыкулы: і за Унію і проціў Уніі — за праваслаўе, а нават — што асабліва цікава — паяўляюцца нясьмелыя галасы проціў праваслаўя і проціў Уніі, а за... лацінскае каталіцтва!

Што-ж мае пачаць БХД і яе орган „Бел. Крыніца“?

Вось-жа БХД і далей стаіць на становішчы IX Разьдзелу сваей праграмы аб рэлігійнай аўтономіі сваіх сяброў. Дзеля гэтага на бачынах „Бел. Крыніцы“ знайдуць магчымасьць свабодна выказаць свае думкі на рэлігійныя тэмы ўсе Беларусы — праваслаўныя, уніяты і лацінньнікі, разважаючы гэтыя пытаньні, ведама, толькі з пункту беларускага нацыянальнага, а ніколі не чапаючы стараны іх ані догматычнай, ані канонічнай.

Пры гэтым зазначаем, што калі мы і хочам рэлігійныя пытаньні разважаць толькі ў плошчы беларускай народнай, гэтым яшчэ ня хочам, каб рэлігія ў Беларусаў была служкай іх нацыянальных інтарэсаў, бо гэта ўважаем за рэч неэтычную і шкодную як самой рэлігіі, так і нацыі, якой рэлігія мае служыць, — а хочам і шукаем такой формы хрысьціянства, каб яно было насіцелькай об'ектыўнай вышэйшай справядлівасьці адносна як нас Беларусаў, так і адносна іншых народаў, на беларускіх землях жывучых.

Дык вось-жа, каб Беларусы, зацікаўленыя рэлігійнымі пытаньнямі, згодна з вышэй сказаным, маглі свабодна выказацца, нікому не накідаючы сваіх думак, «Бел. Крыніца», пачынаючы з наступнага нумару, аткрывае для іх «Вольную Трыбуну».

САМАХВАЛЬСТВА.

Орган віленскіх польскіх дэмократаў „Kurjer Wilenski“ у нумары 258 з дня 10 г.м. зьмяшчае самахвальную стацьцю, у якой цьвердзіць, што *„грамадзянін Польскай дзяржавы мае вольны выбар пачаткавай школы і мовы навучаньня“*.

Каб гэныя словы „Kur. Wil.“ ды папалі, як кажа беларуская пагаворка, — „Богу ў вуха“, дык і Беларусы ў Зах. Беларусі мелі-б родную школу. Але ня туды „Kur. Wil.“ накіраваў свой голас. Выкрыківаючы гэтыя словы, накіраваў ён сваю трубу прадусім заграніцу. А паклікаецца ён у гэтым самахвальстве вось на што.

Віленская Школьная Куратория нядаўна абвесьціла (Dz. Urzęd. Kurat. Nr. 7—8 poz. 82) даволі лібэральны ў тэорыі абежнік (okólnik) з дня 7.VI.1932, дзе між іншым сказана, што... *„бацькі або апякуны, хочачы вучыць дзяцей у іншай школе не ў публічнай* (дзяржаўнай — польскай — рэд.), *павінны прад канцом жніўня паведаміць кіраўніка публічнай* (дзяржаўнай-польскай — рэд.), *у абводзе якой пражываюць“*. Пры гэтым Куратория выдала форму дэкларацыі — паведамленьня і форму пасьведчаньня аб прыняцьці такой дэкларацыі кіраўніком школы публічнай, у якой пацьвярджаецца воля бацькоў, што дзіця будзе вучыцца ў *прыватнай школе: беларускай, літоўскай, або якой іншай*.

Вось і ўсё, на чым „Kur. Wil.“ апірае сваё самахвальства і стараецца замкнуць рот усім, хто «не перастае стагнаць і дзёрці вопраткі на сабе за ўціск народных меншасьцяў у Польшчы», а заграічных крытыкаў кліча на об'ектыўны суд, каб прыглядзіліся да гэтага распараджэньня Віленскай Школьнай Кураторыі, выражаючы пажаданьне, каб і ў іхніх краёх для народных меншасьцяў была такая свабода для народных меншасьцяў.

Калі ўжо і „Kurjer Wilenski“, орган палітыкі польскай пасьля маю 1926 году, на об'ектыўны суд кліча крытыкаў аж з заграніцы, дык трэба прыблізіцца да праўды і паказаць гэту справу так, як яна фактычна выглядае. Гаварыць тут будзем толькі аб Беларусах.

Беларусаў пад Польшчай у Зах. Беларусі ёсьць менш-больш 2.500.000.

У 1926 годзе з Зах. Беларусі Беларусы падалі польскім школьным уладам 412 камплектаў (па 40 дзяцей) дэкларацыяў з просьбай адчыненьня 412 пачаткавых беларускіх школ. З гэтага ўсяго ў Зах. Беларусі маюць цяпер Беларусы, якіх і ведамая польская перапісь у 1931 г. налічыла 1.500.000., толькі нешта каля 62 ня больш нібы ўтраквістычных, нібы беларускіх пачаткавых публічных школ.

Гэтакага ліку пачаткавых школ нават для паўтара міліённага насельніцтва хіба ніводзен заграічны крытык, якіх кліча сюды „Kur. Wil.“, дастатачным не прызнае. Але не аб гэтых — дзяржаўных — школах гаворыць у сваім самахвальстве „Kur. Wil.“. Ён гаворыць аб школах прыватных. Дык скажам мы і аб прыватным пачаткавым беларускім школьніцтве.

Беларусы Зах. Беларусі, як грамадзяне Польскай дзяржавы абложаны на карысьць гэтай дзяржавы падаткамі. Падаткі гэтыя вялікія, а цяпер падчас гаспадарчага крызысу для беларускага сялянскага насельніцтва проста непасільныя. Каб адкрыць прыватную школу, трэба шмат грошай; Беларусы мусяць на гэту мэту самаабкладацца дабравольнымі складкамі, або зьбіраць ахвяры, на зборку якіх агулам ня надта хочуць даваць дазволаў адміністрацыйныя ўлады (прыклад: Стыпэнд. Фонд для незаможнага беларускага студэнства). Але гэта ня ўсё. Ёсьць паважнейшыя факты.

У 1926 годзе, ужо пасьля маю, бо 6 верасьня, Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, сьпярша разаслаўшы просьбы да паветовых школьных інспэктараў аб выдачы канцэсіяў на адчыненьне прыватных пачаткавых беларускіх школ у Зах. Беларусі, зьвярнуўся да Міністэрства Асьветы ў Варшаве так-жа з просьбай, каб міністэрства аблягчыла і прысьпяшыла справу выданьня гэтых канцэсіяў на прыватныя беларускія школы. А канцэсіяў гэтых Б.І.Г. і К. прасіў на адкрыцьцё школ у в. в: 1) Рудаўцы, 2) Малы-Угрынь, Слонімскага пав., 3) Асташына, 4) Любанічы, Наваградзкага пав., 5) Лукі, Стаўпэцкага пав., 6) Смолічы, 7) Леановічы, 8) Цекалоўшчына, Нясьвіскага пав., 9) Анісімовічы, Баранавіцкага пав., 10) Барадзенічы, 11) Цяцеркі, 12) Шаўляны, Браслаўскага пав., 13) Дамуці, Дзісьненскага пав., 14) Сярэдняе-Сяло, Валожынскага пав., 15) Ядзейкі, Маладэчанскага пав., 16) Долкі, Косаўскага пав. і 17) Зарэччы, Пружанскага пав.

І што-ж вышла? А проста нічога!

Стоўпэцкі школьны інспэктар паставіў вымаганьні, якіх Б.І.Г. і К. ніяк ня мог выканаць, Браслаўскі шк. інсп. канцэсію на школу ў Барадзенічах даў, але не зацьвердзіў вучыцеля, Дзісьненскі шк. інсп. канцэсіі ня даў, Косаўскі шк. інсп. паставіў такія-ж варункі, як інсп. Стоўпэцкі, а рэшта нават не адказалі і на просьбы. Міністэрства Асьветы, таксама ўжо па маю 1926 г., бо пісьмом

з дня 1.IV.1927. за № 1—18806-26 паведаміла, што трэба споўніць вымаганьні адпаведных школьных уладаў.

Гэта так было скора пасьля маю 1926 г., але ня лепш было і ў наступных гадох.

Ад 1927 году забадзялася неяк і існавала адзіная ў Зах. Беларусі прыватная пачаткавая беларуская школа ў Шаўлянах Браслаўскага пав. аж да сёлетняга 1932 году, канцэсія на якую была выдана Бел. Інст. Гасп. і Культ. Вучыцелькай у гэтай школе была мяйсцовая жыхарка М. Булыга. Да леташняга году школьныя ўлады яе пацьвярджалі і ўсё было ўпарадку. У мінулым годзе Браслаўскі шк. інсп. пробаваў адняць права М. Булыгавай вучыць у той школе, але не ўдалося, бо Віленская Школьная Кураторыя пастановай з дня 31.X.1931 за № 1—31743-31 вучыцельку М. Булыгаву зацьвердзіла на яе становішчы. Але не надоўга, бо сёлета тая-ж Кураторыя пастановай з дня 29.X. за № 1—34029-32 тую-ж вучыцельку Булыгаву на яе становішчы ўжо не зацьвердзіла. А чаму? Вельмі проста. Браслаўскае старасва пісьмом з дня 31.VIII. 1932. за № 13.924-pf. адмовілася выдаць ёй пасьведчаньне аб лёяльнасьці да Польшчы. Вось і канец, каб злажыць дуды ў кут.

Пасьля гэтага Беларусы ў Зах. Беларусі ня маюць ані аднае прыватнай нават пачаткавай школы ў роднай мове. Дык куды-ж Беларусы маюць пасылаць сваіх дзяцей, калі яны *хочуць* вучыць іх у роднай мове, аб свабодзе чаго так моцна закрычаў зажмурыўшы вочы „Kurjer Wilenski"?! Факты гавораць самі за сябе. Яны паказваюць, што Беларусам на «хаценьне» адказвана: ёсьць «цярпеньне».

Дык вось як выглядае прапяяна органам віленскіх польскіх дэмакратаў з пад фірмы „Kur. Wil." самахвальная свабода!

Я. П—к.

Крызыс і слабізна нашага сялянства.

(*Голас з вёскі*).

Пра крызыс шмат ужо пісалася. Няма бадай вяскоўца, каб ён не спаткаўся з гэтым словам. Ня дзіва, столькі гадоў гэты крызыс душыць нашага селяніна. Знае ён добра, што яно абазначае, ня ведае толькі, адкуль гэты крызыс да нас прышоў і калі ён прападзець?

Польскія газэты пішачы аб гэтым крызысе зваліваюць віну пераважна на вайну і пацяшаюць людзей тым, што ўсюды цяпер дрэнна.

Праўда, што галоўнай прычынай цяперашняй галіты ёсьць пераважна вайна і што ўсюды яна далася ўзнакі так, што цяпер бадай усюды горай, чымсі прад вайной жывецца, аднак ня сусім: бо не адна вайна гэтаму ёсьць прычынай і ня ўсюды так дрэнна жывецца, як у нас, асабліва земляробу.

14 гадоў, як вайна заціхла. Пры добрай арганізацыі шмат можна былоб чаго зрабіць, каб раны вайны залячыць, і там, гдзе людзі ўзяліся ўмела да работы, там пра вайну пачынаюць ужо забывацца. Возьмем для прыкладу Літву, якой палякі так ахвотна прарочылі, што яна самастойна не пражывець і году, бо ня мае ані солі, ані зялеза, ані газы і г. д. Там цяпер земляроб куды лепей жывець, чымсі ў нас. Цэнтнар жыта каштуе там 9 літаў і 10 цэнтаў, на нашы грошы — адзін пуд каштуе 3 злоты. Цана, як бачым, падходзіць да нашай, але розьніца ёсьць у тым, што калі там селянін прадасьць пуд жыта, то за гэтыя грошы купіць 6 кілёграм цукру і то польскага цукру, каторы да іх даходзіць праз Латвію. Калі наш селянін прадае тут пуд жыта, то за гэта можа купіць толькі адзін кілёграм цукру. Тут ужо відзім вялікую розьніцу. Таксама ёсьць із зялезам, із соляй, газай і г. д., ня кажучы ўжо пра тытун, каторы ёсьць танейшы і шмат лепшы за польскі. З гэтага ясна, што аб вайне там ужо забываюцца, там яна праходзіць ужо ў гісторыю.

Лепш жывецца земляробу і ў Латвіі, чымсь у нас, не гаворачы ўжо аб Францыі, або Італіі ці Чэхіі.

Якія-ж прычыны злажыліся на гэта, што ў нас горай жывецца селяніну, чымсь у другіх дзяржавах?

Прычын на гэта шмат: галоўная прычына, — што наша вёска не атрымала бадай і сотнае часьці за ваенныя страты. Рээстравалі польскія ўлады і шкоды зробленыя праз немцаў, многа хто хадзіў у павет за сорак і больш вёрст, плаціў на'т пісакам, каб толькі сваечасна падаць сьпісак у адымысловую камісію, але аднак наш селянін нічога з гэтага не дастаў.

Прадваенныя ашчаднасьці нашага сялянства сусім прапалі ў расейскіх паштовых касах ашчаднасьці. Польскі ўрад, заключаючы мір з Бальшавікамі, забавязаў іх зьвярнуць гэтыя капіталы ў золаце ўкладчыкам, але ня чуваць аднак, каб хтоколечы што-небудзь атрымаў. Прапалі вяскоўца ашчаднасьці, зробленыя і вайной. Усім ведама, што наш селянін у час вайны гнаўся за царскім рублём, трымае іх і цяпер, але з іх няма аніякай карысьці і няма ведама, ці будзе яна калі. Золата мала меў хто прыхаванага ды і тое даўно аддаў у трудных часох адбудовы посьля вайны. З гэтага ясна, што вёска наша пасьля вайны асталася сусім абяднеўшай. Урад бадай нічога ёй не памог, за выняткам таго, што даў дзерава на адбудову і то ня ўсім і ня ўсюды.

Францыя, пасьля вайны, калі бальшавікі адказаліся плаціць царскія даўгі, у сябе выкупіла расейскія рэнты (рускія пазыкі) і такім чынам французская вёска акрэпла.

Калі да гэтага дадамо, што наша вёска ня мае ніякага крэдыту, а ў патрэбе пазычае грошы за ліхвярскія працэнты, будзе тагды яснай яе безнадзейнае палажэньне. Аднак гэта яшчэ ня ўсё.

Усім ведама, што цяпер плады земляроба сусім танныя. Ня ў гэтым аднак бяда, што яны танныя, а бяда ў тым, што ўсе фабрыкаты, патрэбныя для земляроба, страшэнна дарагія. Ня так да на вяскоўцу дакавалі, што калі патанее хлеб, то і ўсё патанее. Але так ня ёсьць. Фабрыканты пазакладалі картэлі (саюзы) і на свае вырабы трымаюць цану высокую. Для прыкладу возьмем цэмэнт: пакуль ня было картэляў — цэмэнт быў танны — бочка каштавала 12 зл., а калі фабрыканты парабілі ўмовы—картэлі, то назначылі цэны ў два разы большыя; цяпер тая-ж бочка цэмэнту каштуе 24 зл. Таксама з зялезам і г. д. Ці ня могбы урад прымусіць, каб фабрыканты цэны абнізілі. Пэўне-ж могбы, ён мае шмат на гэта спосабаў: хайбы толькі пазволіў прывесьці з за раніцы танейшых тавараў, то фабрыканты былі-б прымушаны панізіць цэны на свой тавар. Урад аднак на гэта не пазваляе, насамперш дзеля таго, каб фабрычны промысел не занапаў у сваім краі, а з другога боку—гаспадарства мусіць нешта із свайго краю прадаць, каб мець за што купіць патрэбных тавараў, каторых ня мае ў сваім краі. І вось дзеля тэй прычыны мы бачым і такое зьявішча, што ўрад пазваляе фабрыканту падносіць на'т цэны ў сваім краі, каб ён меў магчымасьць таней прадаць свой тавар заграніцай, бо заграніцай фабрыканту трэба канкураваць з другім фабрыкантам, каторы там выробляе тавар няраз лепшы.

Возьмем для прыкладу цукер: заграніцай польскі фабрыкант прадае цукер 25 гр. за кілёграм, яму аднак самому цукер каштуе кілёграм 80 гр. Дык вось, каб фабрыкант ня меў страты, гэтыя 55 гр. даплачываем мы. Дзеля гэтага за кілёграм цукру ў краі плацяць 1 зл. 50 гр. Гэтакая гісторыя паўтараецца і з кожным іншым скарталізаваным таварам. Мала таго, ёсьць шмат дзяржаўных манаполяў на тавары: як соль, тытун і г. д. Здавалася-б, што тут урад лёгка могбы панізіць цэны на сваіх фабрыкатах, аднак ён гэтага чамусьці ня робіць. Праўда, цяпер трошкі панізіў цану на гарэлку, але адначасна падняў цану на соль.

Дык ці-ж няма рады, каб памагчы нашай бядзе? Рада ёсьць, толькі бяда, што нашых рад ніхто ня слухае, а каб гэтых рад паслухалі, трэба нам на вёсцы мець больш арганізацыяў, а ў Сойме сваіх паслоў. А калі-ж, запытаеш чытач, скончыцца гэты праклятыя крызыс?

А ён кончыцца тагды, калі Ты, брат, будзеш сам у сябе гаспадаром і ня будзеш ісьці на паяску чужынцаў, бо помні: што Ты чужым розумам ніколі ня будзеш разумны, а чужым багацьцем — багаты і шчасьлівы.

Б—а.

Arhanizacyjny Statut Biełaruskaj Chryścijanskaj Demokracyi.

I. Siabry BChD.

§ 1. Siabram BChD moža być kožny sielanin, rabotnik i intelihient, jaki — wiedajučy dobra prahramu BChD—nia tolki zhadžajecca z hetaju prahramaju, ale tak-ža hatoŭ pracawać nad stwareńniem świadomaj sarhanizawanaj chryścijanska-demokratyčnaj siły i pačuwaje siabie hatowym na ŭsiakija trudy, z pracaj hetaj źwiazanyja.

§ 2. Abawiazkam kožnaha siabra BChD źjaŭlajecca:

a) wykonywać usialakija arhanizacyjnyja rasparadžeńni, atrymanyja ad partyjnych uładaŭ, a taksama pryjmać partyjnyja stanowiščy, na jakija budzie wybrany;

b) apłačywać partyjnuju składku, raźmier jakoj wyznačaje sam pawodle ŭłasnaha razumieńnia i mahčymaści;

c) čytać i apłačywać hazety, wydawanyja BChD, a taksama pastajanna znachodzić dla ich nowych čytačoŭ i padpiščykaŭ;

d) mieć partyjny bilet.

§ 3. Kožny siabra BChD maje prawa:

a) pryjmać učaście na schodach i źjezdach BChD;

b) wybirać i być wybiranym na ŭsie stanowiščy ŭ partyjnaj arhanizacyi.

§ 4. Siabry BChD pryjmajucca miajscowaj arhanizacyjaj abo wyšejšymi partyjnymi ŭładami.

§ 5. Nichto z siabroŭ BChD nia moža naležać da inšych palityčnych partyjaŭ. Kali-b heta stałasia, taki siabra aŭtomatyčna wyklučajecca z BChD.

§ 6. Kali-b chto z siabroŭ BChD nia wykanaŭ biez dawiedzienaj pryčyny jakoha niebudź z pryniatych na siabie abawiazkaŭ, abo zaplamiŭby s'abie pastupkam, panižajučym hodnaść čaławieka i chryścijanina, dyk hetki siabra na peŭny čas pazbaŭlajecca prawoŭ siabra BChD abo zusim wyklučajecca z partyi. Pazbawić prawoŭ siabra BChD moža kožnaja miajscowaja arhanizacyja. Wyklučyć z BChD maje prawa tolki Centralny Kamitet. Hetaje swajo prawa Centralny Kamitet moža pieradawać i daručać inšym partyjnym uładam.

Pazbaŭleny na peŭny čas prawoŭ siabra BChD maje prawa ŭ praciahu miesiaca abžaławać pastanowu miajscowaj arhanizacyi ŭ Centralny Kamitet, jaki i wyrašaje tady akančalna hetuju sprawu.

II. Miajscowaja arhanizacyja.

§ 7. Siabry BChD, jakija pražywajuć u adnej ci niekalkich susiednich wioskach, stwarajuć partyjny Hurtok. U wialikšych miastečkach i haradoch rajonnyja Hurtki BChD mohuć łučycca ŭ adzinuju Haradzkuju arhanizacyju BChD.

§ 8. Hurtok wybiraje swoj Kamitet, składzieny z troch asob: staršyni, sekretara i skarbnika. Kamitet wystupaje ad imia Hurtka zhodna z pastanowami Hurtka abo zhodna z rasparadžeńniem wyšejšych partyjnych uładaŭ.

§ 9. Schody Hurtka adbywajucca ŭ mieru patreby i sklikajucca z ułasnaj inicyjatywy Kamitetu, na žadańnie troch siabroŭ Hurtka abo na žadańnie wyšejšaj partyjnaj ułady.

§ 10. Da kampetencyi Hurtka naležyć:

a) pryjmo siabroŭ i pazbaŭleńnie ich prawoŭ;

b) wybar delehataŭ na partyjnyja źjezdy;

c) źbirańnie składak, partyjnych achwiaraŭ i padpiski ad siabroŭ na hazetu;

d) wyznačeńnie dla Kamitetu i paasobnych siabroŭ Hurtka prac arhanizacyjna-ahitacyjnych, asabliwa ž pracy ŭ pašyreńni ahitacyjnych drukaŭ i ŭ znachodžańni nowych padpiščykaŭ hazety;

e) pryjmańnie sprawazdačaŭ ab dziejalnaści Kamitetu i paasobnych siabroŭ Hurtka;

f) wyznačeńnie kandydataŭ pry wybarach u hminnuju radu, kasu chworych, a taksama ŭwa ŭsiakija miajscowyja tawarystwy praświetnyja, haspadarčyja i hramadzkija;

g) razważańni nad palityčnymi sprawami

Цярністы шлях літоўскае школы.

Літоўскае прасьветнае таварыства „Rytas“, якое арганізуе літоўскія школы ў Віленшчыне і якое гэтымі школамі апякуецца, нядаўна падала ў літоўскую прэсу („Viln. Rytojus“ № 89) весткі аб палажэньні літоўскай пачатковай школы пад Польшчай.

Вось-жа з гэтых вестак даведваемся аб тых усіх труднасьцях, якія спатыкала і спатыкае літоўская школа з боку польскіх уладаў.

Гэтыя труднасьці, якія звычайна спыняюць літоўскую школу, наступныя. Прадусім ідуць вучыцельскія кваліфікацыі. Гэтымі кваліфікацыямі польскія ўлады памучылі літоўскіх вучыцялёў нямала. Урэшце Літоўцы перашкоду гэту сяк-так агулам паканалі: стварыўся цэлы кадр вучыцялёў, да якіх ужо прычапіцца з прычыны кваліфікацыяў трудна.

Па кваліфікацыях прышла справа дзяржаўнай прыналежнасьці, справа „обывательства“ літоўскага вучыцеля. Пр чэпак і мучэньня было і тут нямала, але ў выніку знашлося многа вучыцялёў літоўцаў— самых праўдзівых «обывателяў» польскіх; такім чынам і гэта труднасьць аказалася пакананай.

Прышла новая бар'ера, якую мусіў пераскочыць літоўскі вучыцель: — палітычная маральнасьць. Ну, але ў нашым веку ўсякага спорту і агулам фізычнага выхаваньня, літоўскі вучыцель з трудом і гэту бар'еру пераскочыў.

Тады прышлі падручнікі. Польскія школьныя ўлады забаранілі ўжываць у літоўскай школе цэлага рада падручнікаў, якія — бачыце — зашмат талкуюць аб Літве, аб Вільні, аб краі, а замала аб Польшчы. Пры дружным аднак напоры літоўскага віленскага грамадзянства і пры „зацікаўленьні“ падручнікамі літоўскага ўраду ў Незалежнай Літве, справа гэта неяк была разьвязана і перастала быць актуальнай.

А вось апошнім часам, ужо ў сёлетнім школьным годзе, выплыла для літоўскіх школ справа памешканьня. Справа гэта ўжо выплывае з новага школьнага закону.

Усе школы ў Польшчы маюць быць упарадкаваны паводле гэтага закону да 1934 г. Адносна літоўскіх аднак школ Віленскі Школьны Куратар закон гэны пачаў выконваць з сёлетняга году.

Новы гэты закон і старым і новым школам ставіць чатыры варункі. Найтруднейшы з іх — гэта „адпаведнае“ памешканьне. Аб адпаведнасьці дэцыдуе ваявода. Вось-жа ваяводская камісія агледзіла будынкі, у якіх месьцяцца літоўскія школы, і да пачатку лістапада сёл. г. адпаведным на школу не прызнала ані аднаго. І нічога дзіўнага. Вымагаюць, каб школьнае памешканьне на вёсцы мела 50 кв. мэтр. і 40 цм. плошчы і 3 мэтры і 20 цм. вышыні, а вокны павінны быць роўны $^{1}/_{5}$ плошчы клясы. Такіх памешканьняў у бедных сёлах літоўскіх нашага краю бадай што цалкам не знайдзецца, а знача — ня будзе і школы літоўскай. Праўда, зроблена «ласка»: дадзены тэрмін на будову „адпаведных“ школьных будынкаў... да месяца сьнежня сёл. году!

Што гэта ўсё знача, — само сабой зразумела. Вось-жа цяпер літоўскае віленскае грамадзянства стаіць прад новай школьнай „загадкай“. Як яно „загадку“ гэту разгадае, — пакажа недалёкая будуч ня.

Ясна, што ўсе гэтыя „загадкі“ стаяць і прад Беларусамі, з тэй толькі рожніцай, што нам іх „разгадаць“ куды трудней, як Літоўцам.

Вялікі ўжо насьпеў час супольнай беларуска-літоўскай абароны сваіх правоў на ніве народнай беларускай і літоўскай асьветы пад Польшчай.

К. М.

Janka Kupała i Jakub Kołas

(1882 — 1932)

Jubilej 50-ci hodździa Janki Kupały i Jakuba Kołasa wilenskaje biełaruskaje hramadzianstwa abchodzić 27 listapada sioł. hodu.

Uračystaja akademija adbudziecca ŭ niadzielu 27 listapada ŭ b. zali „Apollo“, pry wul. Dombrowskaha 5 u Wilni, a hadzinie 18-aj, pawodle nastupnaj prahramy:

1) Referat ab tworčaści Janki Kupały i Jakuba Kołasa pračytaje hram. St. STANKIEWIČ;
2) Biełaruski narodny chor — pad kiraŭnictwam rehienta hram. R. ŠYRMY.
3) Deklamacyi wieršaŭ Kupały i Kołasa.

Uwachod na akademiju biaspłatny pa zaprosinach i ŭwachodnych biletach, jakija zahadzia možna dastać u Knibarni „Pahonia“ — Wilnia, Zawalnaja 6—10.

Kamitet dzieła arhanizacyi akademii jubileju J. Kupały i J. Kołasa.

З беларускага жыцьця.

Новыя гурткі Бел. Інст Гасп. і Культуры У апошнія часы паўсталі новыя гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры:

1) у в. Іванавічы, Моўчадзкай вол., Баранавіцкага пав.

2) у Баранавічах і

3) у в. Райца, Навагрудзкага пав.

„Chryścijanskaja Dumka“, беларуская рэлігійная каталіцкая месячная часопісь за м-ц лістапад 1932, гэтымі днямі выйшла з друку.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

„Беларуская Школа ў Латвіі“, папулярна-навуковы, пэдагогічны і літэратурнаграмадзкі штомесячнік № 5 (15) за м-ц кастрычнік 1932 г. выйшаў з друку. Зьмест багаты і цікавы.

Зачыняюць беларускія школы і звальняюць беларускіх вучыцялёў. Апошнімі часамі нацыяналістычная палітыка латвійскага ўраду моцна націснула сваю руку на беларускае школьніцтва, якое латыскімі школьнымі ўладамі безпашчадна ліквідуецца. Даведваемся, што адна з рэдкіх бел. школ у Дзьвінскім пав. у в. Вайдюеве гэтымі часамі зачынена, а беларускія вучыцялі Талерка і Казлоўскі звольнены з пасадаў.

10 ыя ўгодкі працы паэты Пятра Сокала. У траўні с. г. кончылася 10 гадоў працы паэты П. Сокала. З гэтай прычыны „Беларускае Выдавецтва ў Латвіі“ рыхтуецца выдаць зборнік яго вершаў.

З Польшчы.

Былы міністр Зямельнай Рэформы, пасол Б.Б. праф. Станевіч зрокся пасольскага мандату.

Новы міністр Заграпічных Спраў Бэк заявіў, што заграпічная палітыка Польшчы прынцыпова ня будзе зьменена.

Чыстка ў Б.Б Старшыня парлямантарнага клюбу п ртыі Б.Б. выдаў загад, каб у гэтай партыі была праведзена чыстка і павыганяны непатрэбныя з партыі Б.Б. людзі.

Дэфіцыт пошты і чыгункі. Дзяржаўны бюджэт лічыў, што ў сёл. бюджэтным годзе пошта дасьць дзяржаўнаму скарбу больш 25 мільёнаў зл. чыстага даходу, а чыгунка аж 50 мільёнаў зл. такога даходу. Тымчасам, у м-цы верасьні с. г. пошта дала 689 тысяч зл. дэфіцыту, а чыгунка ў працягу 3-х месяцаў (ад ліпеня да верасьня) дала також дэфіцыт аж 3 з палавінай мільёнаў зл.

---

i pryjmańni pastanowaŭ jak ahulnych, tak i ŭ sprawach miajscowaha charaktaru.

§ 11. Adkaznym pierad partyjaj za pracu Hurtka źjaŭlajecca Kamitet Hurtka.

III. Pawiatowaja arhanizacyja.

§ 12. Siabry BChD, jakija žywuć u adnym pawiecie, składajuć arhanizacyju BChD danaha pawietu.

§ 13. Siabry BChD źbirajucca nia mienš adnaho razu ŭ 3 hady na Pawiatowy źjezd.

§ 14. Pawiatowy źjezd BChD sklikajecca Pawiatowym Kamitetam:

a) pastanowaj Pawiatowaha Kamitetu;
b) na žadańnie wyšejšaj partyjnaj ułady;
c) na žadańnie najmienš troch partyjnych Hurtkoŭ.

§ 15. Pawiatowy źjezd:

a) wybiraje Pawiatowy Kamitet u składzie staršyni, sekretara, skarbnika i dwuch kandydataŭ;
b) pryjmaje sprawazdaču ab dziejalnaści Kamitetu;
c) razwažaje sprawy palityčnyja i wynosić u hetych sprawach swaje pastanowy;
d) wybiraje delehataŭ na partyjny Ahulny Źjezd.

§ 16. Zasiadańni Pawiat. Kamitetu wyznačajucca:

a) pastanowaj papiaredniaha zasiadańnia;
b) staršynioj Kamitetu z ułasnaj inicyjatywy abo na žadańnie dwuch siabroŭ Kamitetu;
c) na žadańnie wyšejšaj partyjnaj ułady.

§ 17. Da abawiazkaŭ Pawiatowaha Kamitetu naležyć:

a) padhatoŭka i sklikańnie pawiatowych źjezdaŭ;
b) kantralawańnie dziejalnaści miajscowych Hurtkoŭ;
c) wykonywańnie pastanowaŭ źjezdaŭ;
d) arhanizawańnie mitynhaŭ i palityčnych naradaŭ, kirawańnie palityčnaj dziejnaściaj na abšarach pawietu ŭ metach pahłybleńnia świadomaści biełaruskich sialanskich i rabotnickich masaŭ i pašyreńnia arhanizacyi;
e) składańnie Centralnamu Kamitetu sprawazdač ab partyjnaj dziejalnaści, a taksama ab palityčnym, kulturnym i haspadarčym žyćci ŭ pawiecie.

§ 18 Pawiatowy Kamitet pawinien utrymliwać stałuju suwiaź z Kamitetami Hurtkoŭ i z Centralnym Kamitetam. Prezydyum wydaječ siabroŭskija bilety; kantraluje padpisku na hazetu i siabroŭskija składki, a taksama kantraluje pašyrańnie partyjnych drukaŭ.

Adkaznym pierad Centralnym Kamitetam za stan pracy ŭ pawiecie źjaŭlajecca Pawiatowy Kamitet; hety-ž kamitet padaječ Centralnamu Kamitetu śpis usich siabroŭ BChD u pawiecie.

IV. Akružnaja arhanizacyja.

§ 19. Centralny Kamitet, kali znojdzieć patrebnym, stwaraje Akružnyja Arhanizacyi BChD, złučajučy ŭ ich pa niekalki pawiatowych arhanizacyj.

V. Ahulny Źjezd.

§ 20 Najwyšejšaj uładaj BChD źjaŭlajecca Ahulny Źjezd. Ahulny Źjezd pastanaŭlaje ab usiej palityčnaj i arhanizacyjnaj dziejalnaści BChD, a taksama ab prahramie, taktycy i statucie, wybiraje Centralny Kamitet i Rewizyjnuju Kamisiju BChD, a tak-ža pryjmaje ad ich sprawazdaču.

§ 21. Ahulny Źjezd składajecca z pradstaŭnikoŭ partyjnych uładaŭ, z delehataŭ hurtkoŭ i pawiatowych kamitetaŭ, a tak-ža z mužoŭ dawieru i partyjnych pracaŭnikoŭ i sklikajecca Centralnym Kamitetam nia mienš adnaho razu ŭ 3 hady. Na žadańnie najmieš 7 arhanizacyj pawiatowych (źjezdaŭ ci pawiatowych kamitetaŭ) Centralny Kamitet abawiazany sklikać Ahulny Źjezd u praciahu troch miesiacaŭ.

(d. b.)

Мала прачытаць газэту самому:
трэба
яе прачытаць сабраным суседзям разам!

За 2 м-цы 400 судзьдзяў на эмэрытуру. У працягу каля 2-х месяцаў, паводле спэцыяльна выданага закону, можна былоператасоўваць з мейсца на мейсца судзьдзяў у Польшчы. За гэты час больш 400 судзьдзяўператасавана на эмэрытуру, якім дзяржаўны скарб будзе выплачываць менш-больш па 400 зл. месячнага пэнсіону.

Польскі сьпірытус прывезены кантрабандай у Польшчу танейшы. Газэты падаюць, што на Паморʼі паліцыя выкрыла прывезены з заграніцы кантрабандай польскі сьпірытус, які гандляры пасьля гэткай практыкі сюды-туды гэты сьпіртус прадавалі таней, як той, які нікуды заграніцу не «выяжджаў.»

З заграніцы.

Выбары прэзыдэнта ў Амэрыцы. У гэтым месяцы адбыліся выбары прэзыдэнта ў Зл. Шт. Паўночнай Амэрыкі. На прэзыдэнта выбраны вялізарнай большасьцяй галасоў кандыдат партыі дэмократаў — Франклін Русвэльт. Адначасна дэмакраты здабылі ў гэтых выборах большасьць паслоў у парлямант. Да гэтых выбараў заграннічныя палітыкі прывязваюць вялікую вагу, якая можа мець уплывы і на палітыку міжнародную, асабліва эўрапэйскую.

У С.С.Р.Р. пачалі ўрачыста сьвяткаваць 15-ыя ўгодкі бальшавіцкай рэвалюцыі. З прычыны гэтай сьцягваюць у Маскву „дэлегатаў" і „гасьцей" з усяго сьвету, каб паказаць, што можна з дасягненьняў камуністычнага будаўніцтва, спрытна хаваючы ў кут галодных і абдзёртых.

Крывавае завярушэньне ў Жэневе. Дня 9 г. м. у Швайцарыі ў Жэневе выбухнула раптоўна крывавае рэвалюцыйнае завярушэньне. Рэвалюцыйны рух здушаны. Ёсьць 11 асоб забітых і каля 100 раненых.

У Манджурыі ўзноў ідуць баі між Японцамі і кітайскімі партызанамі. Да Кітайцаў перайшло некалькі тысяч манджурскага войска, але ў канцы Японцы разьбілі паўстанцаў, якіх згінула на полі барацьбы каля пяцьтары тысячы асоб. На царка Манджурыі кітайскія студэнты зрабілі напад, але напад ня ўдаўся. Аднаго студэнта злавілі.

Гандзі ўзноў загразіў галадоўкай, калі гіндускія касты ня выканаюць дагавору заключанага з ім аб роўнапраўі парыяў.

Дробныя гаспадарчыя весткі.

— У Зл. Шт. Пауноч. Амэрыкі і ў Канадзе такія вялікія запасы пшаніцы, што няма надзеі, каб сёлета збожжа падаражэла. Апрача гэтага ў паўдзённай Амэрыцы, Аргентыне, і Аўстраліі спадзяюцца цяпер (там жніво адбываецца ў сьнежні і студзені) большага ўраджаю, як у мінулых гадох, бо засеяна большая плошча пшаніцай.

— У Аргентыне і Канадзе тона пшаніцы каштуе 9 даляраў, а тона аплак дзераўляных 10 даляраў.

— У Польшчы ўжо паявіліся ў абегу 2 зл мэталёвыя манэты. Яны меншыя ад цяперашніх 50 гр. манэт. Рысункі на іх падобныя да тых, што на 10 зл. манэтах.

— Польскае мін. Скарбу загадала сьпісаць земляробаў-падатнікаў, якія маюць залеглыя падаткі і пачаць процію іх энэргічную экзэкуцыйную акцыю.

— Газэты падаюць, што ў Польшчы расходзіцца цукру толькі па 75 дэк. на асобу. Падчас вайны людзі больш куплялі цукру, бо расходзілася па 1 кілёгр. на асобу.

З краю.

Кара сьмерці. Дня 9 г. м. даразны суд у Ваўкавыску засудзіў за рабунак Я. Камайчыка, Я. Дульчэўскага і Я. Капітана на кару сьмерці. Засуджаных павесілі.

Казённы „тыдзень землеробства." Мінулы тыдзень быў абвешчаны казённай партыяй Б.Б. „тыднем землеробства." У працягу гэтага тыдня асадніцкія арганізацыі разам з „Кулкамі рольнічымі" гэты тыдзень сьвяткавалі і ў нашым краю. Зьбіраліся, гаварылі, стагналі і хваліліся, што добра ёсьць, а будзе яшчэ лепш.

Польскі тэатр абʼяжджае Зах. Беларусь. У Вільні зарганізаваўся польскі тэатр, які пачаў ужо разʼяжджаць па Зах. Беларусі і гэтак прапагаваць сярод беларусаў польскую сцэнічную культуру. Аб разʼязным тэатры трэба парупіцца і беларусам.

З Вільні.

Гэтак пачынаецца „паньствова" узгадаваньне ў беларускай філіі Дзярж. Гімназіі ім. Ю Славацкага. 10.XI сёл. году, прада днём сьвята незалежнасьці Польшчы, адбылася ўрачыстасьць у бел. філіі Польскай Гімн. Славацкага. Дыр. Астроўскі „утраквістычна" прамовіў да вучняў, падчорківаючы, што раз мы (гэта знача ён) цешымся з Польскай незалежнасьці, дык некалі... і палякі будуць цешыцца з нашай незалежнасьці! Лоўка сказана! „Умри Деніс, лучше не выдумаеш"!

Пасьля дырэктарскай прамовы былі аж два рэфэраты вучняў аб змаганьні Палякоў за незалежнасьць. Абодва рэфэраты былі сказаны... па польс у! Пытаем, ці-ж ня лепш было-б, хоць ужо і тое самае, сказаць пабеларуску? Думаем, што так, бо тады хоць для вока выглядала-б, што беларускія вучні бралі ўдзел у сьвяткаваньні, а не казённыя нявольнікі. Як-жа далёка захаваны быў у гэны дзень лёзун Марш. Пілсудскага: „вольні з вольнымі, рувні з рувнымі"! Моладзь адчула гэта балюча і дзеля таго інстынктоўна ніхто з яе нават і не разявіўся на прагаломшаны кліч, славячы Польшч і марш. Пілсудскага.

„Шлях". Пад гэткім загалоўкам паказалася ў сьвет пісаная пабеларуску газэта. Што-ж гэта такое? Ні хорт, ні выжал. Ні ладу ў гэтай газэце, ні складу, ні вобліку. Шкода на гэткую газэту псаваць паперу! Ну, але спадзяёмся, што ў наступным нумары Казючок скажа, чаго ад яго хочуць.

Зблаўся. Арцыб. Ялбжыкоўскі быў ужо на капліцы Вострай брамы загадаўшы прыбіць надпіс палацінску, але—як пачалі гарлапініць польскія чорнасоценцы—дык збаяўся і надпіс загадаў зьдзёрці. Цікавасьць, што з гэтага ўсяго выйдзе!

Да нас пішуць.

БРАТЫ, ДАВОЛІ СТАГНАЦЬ, — ІДЗЁМ ДА ПРАЦЫ!

Іванавічы, Бяранавіцкага пав. Доўга прыглядаўся я да праяваў жыцьця беларускай вёскі. Чытаў многа аб гэтых праявах і ў „Бел. Крыніцы". Сам я яшчэ да гэтай пары нічога ня пісаў у сваю родную газэту. Але цяпер пастанавіў пісаць і заклікаць свой народ, асабліва моладзь, да працы ў роднай арганізацыі.

Прадусім звярочваюся да суседніх вёсак: Саўчы, Калесьнікі, Александравічы, Люшнево і Сьвіраны, Моўчадзкай воласьці з такім вось запытаньнем: чаму гэта ў нашай Моўчадзкай воласьці няма ані аднае беларускай арганізацыі? Пры гэтым з трыбуны «Бел. Крыніцы» хачу падзякіць з чытачамі сваімі спасьцярогамі ў нашым беларускім жыцьці. Моʼ «Бел. Крыніца» гэткія заўвагі ўжо і выказвала, але яны яшчэ і цяпер актуальныя. Ня буду гаварыць аб нашай ліхой долі, бо гэткая гаворка ўнесьць толькі няпэўнасьць і духовую дэпрэсію. Хачу гаварыць аб справах позытыўных, якія дадаюць пэўнасьці і пакрапляюць народ духова.

Памятайма, што толькі праца культурная і грамадзкая дае позытыўную карысьць у нашым народным і соцыяльным адраджэньні.

Браты Беларусы! Скажам мы ўсе, як адзін: — Да працы! Да чыну! Але ведаймо, — трэба, каб дзейнасьць наша апраўдала наш кліч. Кожнае слова, кожны наш чын павінен, як удар молата, каваць нашу будучыню. Каб прыступіць да гэтай працы, мусім арганізавацца.

Мы беларусы кажам, што нас ёсьць у Зах. Беларусі больш 2-х мільёнаў. Гэта шмат галоў. А колькі-ж нас ёсьць у сваіх беларускіх народных арганізацыях? На тысячы нашых вёсак і мястэчак мы маем некалькі дзесяткаў сваіх арганізацыяў на сяле. Колькі-ж ёсьць гурткоў Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры? Дзе гурткі Т-ва Беларускае Школы? Дзе нашы арганізацыі палітычныя? Дзе нашы коопэратывы? Усяго гэтага вельмі мала, а ў некаторых мяйсцох і зусім няма.

Памятаймо, што рэальную сілу мы можам прадставіць толькі ў арганізацыі. Пакуль мы ня створым моцнай і сільнай сваей народнай арганізацыі, будзем толькі бядаваць і наракаць на свой лёс, — паправы ад гэтых бядаваньняў ды нараканьняў мець ня будзем.

Дык арганізуймося і ўсе да працы ў арганізацыях!

Мы ня маем патрэбнай нам колькасьці сваіх родных беларускіх школ, ня маем належнага прадстаўніцтва ў дзяржаўным парляманце. А чаму? Бо мы не абʼяднаны ў сваей роднай арганізацыі.

Мы прывыклі ўжо вечна чакаць, што нехта аднекуль прыдзе і нам добра зробіць, а дзеля гэтага проста расхварэліся мы даверчывасьцяй абяцанкам чужынцаў. Ведаем аднак ужо з практыкі, што гэтыя абяцанкі чужынцаў і часта ворагаў нашых так і астаюцца абяцанкамі, а мы надалей астаёмся ў так м-жа або яшчэ і горшым палажэньні, як былі, і толькі бядуем і наракаем на свой лёс.

Хіба-ж кожны з нас мае пажаданьні, каб мы маглі карыстацца ў паўнаце з належных нам правоў. Дык дамагаймася гэтага. А асягнуць гэта можам праз моцную сваю арганізацыю.

Чытачы «Крыніцы»! Мы чуем патрэбу чытаць сваю родную газэту і хочам даведацца аб беларускім жыцьці па нашых сёлах. Дык пішэмо ў «Крыніцу» карэспандэнцыі, але ня пішэмо глупстваў, бо апошнія каму-ж цікавы і якую дадуць карысьць нашай агульнай справе. Пішэмо аб справах маючых народнае, культурнае і грамадзкае значэньне. Вартасьць гэткіх вестак вялікая. Прыкладам, карэспандэнцыі з Ляхавіч і іншыя дык проста вучаць, як трэба будаваць сваё жыцьцё.

Апрача гэтага, усьведамляйма нясь едамых сваіх суседзяў і знаёмых. Пашыраймо свае газэты і кніжкі. Закладаймо свае родныя арганізацыі, адкрываймо бібліятэкі-чытальні, ладзьма беларускія прадстаўленьні і г. д.

Дык няхай Зах. Беларусь пакрыецца сеткай гурткоў Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, а «Беларуская Крыніца» запоўніцца весткамі аб працы беларусаў на роднай ніве!

М. Стальны.

НАКЛАДАНЬНЕ ДАХОДАЎ.

Косава. Ніхто яшчэ бадай не дадумаўся так лёгка рабіць з бедных ды багатых, як камісія шацунковая Косаўскага павету на Палесьсі. Яна дык умее сусім беднаму чалавеку «налажыць» такія даходы, аб якіх ён і ня сьніў. Чалавек, каторы пасе скаціну, ніколі ня меў добрай адзежы на сабе ды заўсёды насіць лазовыя лапці, — дастае „наказ платнічы", каб заплаціў 33 злоты падатку даходовага, бо ў яго «налічылі» 1.500 злотых гадавога даходу. Сьвяшчэньнік, які мае з парафіі якіх 200 злотых даходу ў год, а з гаспадаркі нават пражыць ня можа, а мусіць прыкупляць нават хлеба, — дастае наказ, каб заплаціў 130 зл. тагож падатку, бо ў яго «налічылі» аж 3397 злотых даходу. У прошлым годзе было толькі 2000 даходу, а ў гэтым ужо больш, бо... жыта нажаў аж 6 коп, зрослага, ды згнілога і бульбы накапаў амаль не ў палавіну менш, як у прошлым годзе! Але як-жа заплаціць трэбаваныя падаткі, калі хто якую карову мае, то яна разы 2 або 3 засэквэстравана.

Бабравец.

КАМАНДАНТ НЕ ТАГО ГЛЯДЗІЦЬ.

Камарова, Будслаўскай гм., Вялейскага пав. У Будславе ёсьць гурток Бел. Інст. Гасп. і Культуры. Усе кругом аб гэтым ведаюць і рады, што ёсьць. Найбольш дзейны сябра гэтага гуртка — грам. Б. Бабарыка. Усе яго знаюць і ведаюць, што ён чалавек акуратны. Аб ім сусім інакш думае мусіць толькі Будслаўскі камандант паліцыі. Надовячы праходзіў ён вечарам праз нашу вёску. Спаткаў некалькі хлапцоў на вуліцы і давай пытаці, ці ня быў з імі разам Бабарыка. Калі-ж хлопцы адказалі, што ў іх вёсцы цяпер яго няма, камандант сказаў адно: —«глядзіце!»Хлопцы нашы паціскалі плячамі з зьдзіўленьня і адразу даведаліся, што камандант не далюблівае беларускай работы, якую робіць Будслаўскі гурток з сваім дзейным сябрам — грам. Бабарыкам. Дык не таго глядзіць камандант. Глядзеў-бы лепш, каб ня было зладзейства...

Сусед.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.